Такім чынам, зроблены тапанімічны аналіз пацвярджае прапанаваную гіпотэзу.

Сабраны матэрыял зафіксаваны ў слоўніку «Тапонімы Ханявіцкага сельскага Савета Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці», які складаецца з 91 тапоніма.

УДК 94"1569/1795"

Навуч. В. Р. Стаброўская
Навук. кір. К. В. Маціеўская, настаўнік гісторыі
(ДУА "Каладзішчанская сярэдняя школа")

## ВАЕННАЯ ІНТЭРВЕНЦЫЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У МАСКОЎСКУЮ ДЗЯРЖАВУ

На канец XVI – пачатак XVII стст. прыпадае дынастычны крызіс у Маскоўскай дзяржаве, які ў гістарыяграфіі атрымаў назву "Смута"(1598-1613 гг.). [1, с. 93]. Улічваючы той факт, што ўсё папярэдняе стагоддзе суправаджалася бесперапыннымі войнамі паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, у выніку якіх ВКЛ страціла значныя тэрыторыі, кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт III Ваза не мог упусціць магчымасці выкарыстаць у сваіх інтарэсах цяжкае становішча суседняй краіны і вярнуць страчаныя раней землі [2, с. 116].

Падставай для ўмяшання ва ўнутрыпалітычныя справы Масквы паслужыла з'яўленне на тэрыторыі ВКЛ самазванца, які выдаваў сябе за ўратаванага царэвіча Дзмітрыя Іванавіча, загінуўшага яшчэ ў 1591 г. пры невядомых абставінах.

Для заняцця прастола Маскоўскай дзяржавы Лжэдзмітрый I вырашыў заручыцца падтрымкай каталіцкіх колаў Рэчы Паспалітай і непасрэдна з каралём Жыгімонтам III. У якасці платы за дапамогу ў барацьбе за прастол самазванец абавязваўся перадаць Рэчы Паспалітай Смаленск і Северскую зямлю і спрыяць распаўсюджанню каталіцтва на тэрыторыі Расійскага царства[4, с.54].

У кастрычніку 1604 г. войска Лжэдзмітрыя I, якое складалася з дзвух тысяч наёмнікаў, перайшло межы Расіі. Нягледзячы на слабасць войска самазванцу, удалося дасягнуць пэўных поспехаў. Што было абумоўлена шырокай падтрымкай сярод расійскага насельніцтва ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага крызісу. Распаўсюджаныя ў народзе манархічныя ілюзіі спрыялі з'яўленню чутак аб выратаванні царэвіча Дзмітрыя, якога з лёгкасцю атаясамлівалі з самазванцам. На яго бок перайшлі сяляне, якія пакутавалі ад феадальнага гнёту, казакі, незадаволеныя наступленнем дзяржавы на паўднёвыя ўскраіны. У выніку, без супраціўлення былі ўзяты гарады Чарнігаў, Пуціўль, Рыльск і Сеўск.

Пасля смерці Барыса Гадунова ў маі войска, што размяшчалася пад Кромамі, прысягнула Дзмітрыю. Дзякуючы падтрымцы з боку баярства Лжэдзмітрый у чэрвені 1605 г. урачыста ўступіў у Маскву, а 22 ліпеня вянчаўся на царства. Але ў хуткім часе стала зразумелым хісткае становішча Лжэдзмітрыя на царскім прастоле. Праваслаўная царква падазрона ставілася да Лжэдзмітрыя, які аказаўся на прастоле пры дапамозе палякаў і абгрунтавана падазраваўся ў таемным веравызнанні каталіцтва. Незадаволенасць выклікалі і паводзіны палякаў, што прыбылі ў сталіцу разам з самазванцам. Таму 17 мая 1606 г. Васілём Шуйскім, Васілём Галіцыным і Тацішчавым было ўзнята народнае паўстанне супраць цара, у выніку якога самазванец быў забіты [3, с.406].

Адразу пасля смерці Лжэдзмітрыя маскоўскі дваранін Міхаіл Малчанаў пачаў распаўсюджваць звесткі аб тым, што сапраўдны Дзмітрый выратаваўся, а замест яго забілі іншага чалавека. У паяўленні новага самазванца былі зацікаўлены розныя грамадскія сілы, як звязаныя з першым самазванцам, так і незадаволеныя уладай Васіля Шуйскага. Збегшы ў Рэч Паспалітаю Малчанаў хутка знайшоў новага самазванца. Папулярнасць у народзе Лжэдзмітрыя значна ўзрасла паля яго прызнання Марынай Мнішак (жонка Лжэдзмітрыя I). Вясной 1608 г. пад Балховам было разбіта войска Шуйскага, а ў чэрвені Лжэдзмітрый II размясціўся ў Тушыне пад Масквой. У асаджанай Маскве пачаўся голад, у выніку чаго В. Шуйскі быў вымушаны пайсці на перамовы са Швецыяй, разлічваючы на ваенную дапамогу.

Уступленне Жыгімонта III на тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы прывяло да распаду тушынскага лагеру. Ваяводы Лжэдзмітрыя II здавалі горад за горадам. Няўдачы пасеялі разлад сярод прыхільнікаў самазванца. Адны задумвалі тайныя перамовы з Шуйскім, іншыя шукалі выратавання ў лагеры інтэрвентаў пад Смаленскам.

У сувязі з гэтым Лжэдзмітрый II уцёк у Калугу, дзе скардзіўся жыхарам на здраду польскага гетмана і пакляўся не аддаваць іншаземцам зямель царства, але разам з усім народам загінуць за праваслаўную веру. Гэты прызыў знайшоў водгук сярод насельніцтва горада. Прыцягнуўшы на свой бок шматлікіх прыхільнікаў, Лжэдзмітрый II уступіў у вайну на гэты раз ужо з двума гасударамі: царом Васілём і каралём Жыгімонтам III. Яму зноў прысягнулі шматлікія гарады. [4, с. 215]. Але ў снежні 1610 года Лжэдзмітрыя II забіў хрышчоны татарын Пётр Урусаў за асабістую крыўду. Гэта падзея выклікала жахлівае хваляванне ў Калузе, а ўсе татары ў горадзе былі перабіты.

Пасля пазбаўлення ўлады В. Шуйскага, кіраўніцтвам дзяржавай быў абраны савет з сямі баяр, які заключыў дагавор аб прызванні

польскага каралевіча Уладзіслава на маскоўскі прастол пры ўмове пераходу новага цара ў праваслаўе. [1, с. 108].

Апалчэнне Мініна і Пажарскага прывяло ды вызвалення Масквы ад прысутнасці іншаземцаў, але на гэтым ваенныя дзеянні паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай не скончыліся. Працягваліся ваенныя дзеянні на памежжы дзяржаў, а ў 1617 г. Уладзіслаў беспаспяхова спрабаваў вярнуць сабе расійскі прастол. Толькі ў 1618 г. бакі заключылі Дэулінскае перамір'е, па ўмовах якога Рэч Паспалітая атрымлівала Смаленск Дарагабуж, Сярпейск, Трубчэўск, Ноўгарад-Северскі, Чарнігаў і яшчэ шэраг гарадоў, а Уладзіслаў захоўваў за сабой тытул рускага цара [2, с. 120].

Такім чынам, распачатая яшчэ ў 1604 г. інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Маскоўскую дзяржаву дасягнула пастаўленай мэты: вяртанне страчаных тэрыторый у мінулым стагоддзі. Для дасягнення гэтай задачы польскі кароль Жыгімонт III аказваў фінансавую і ваенную падтрымку самазванцам у барацьбе за маскоўскі прастол. Першапачаткова Лжэдзмітрый карыстаўся значнай падтрымкай сярод насельніцтва Расійскай дзяржавы, якое верыла ў яго царскае паходжанне. Але з-за прыхільнасці Лжэдзмітрыя I да каталіцтва, яму не ўдалося замацавацца ў сталіцы Расіі ў якасці цара. Другая ж спроба пасадзіць на прастол царэвіча Дзмітрыя аказалася менш паспяховай, самазванцу не ўдалося захапіць Маскву. У 1609 г. Рэч Паспалітая, якая да гэтага толькі патаемна вяла барацьбу супраць Расіі, аб'яўляе вайну. Пасля працяглай аблогі Смаленска, уступлення ў Маскву і шэрагу ваенных перамог, польскі каралевіч Уладзіслаў быў абраны на царства. Але з-за нежадання пераходу ў праваслаўе Уладзіславу не ўдалося ўсталяваць сваю ўладу ў Маскве.

## ЛІТАРАТУРА

1. История внешней политики России. Конец XV в. – XVII век (От свержения ордынского ига до Северной войны). – М.: Междунар. отношения, 1999. – С. 196–208.

2. Соловьев, С. М. Сочинения. В 18 кн. Кн. V. Т. 9–10. История России с древнейших времён / Отв. Ред.: И. Д. Ковальченко, С. С. Дмитриев. – М.: Мысль, 1990. – С. 7-242.

3. Костомаров, Н. И. Названный Дмитрий // Русская история в жизнеописаниях её главнейших деятелей / Н. И. Костомаров. – М.: Мысль, 1991. – С.393–418.

4. Скрынников, Р. Г. 1612 / Р. Г. Скрынников. — М.: Харвест, 2007. – 283 с.